


# *ВЯСЁЛЫЯ СЮЖЭТЫ АД БАБУЛІ*

Вядомая пісьменніца Людміла Кебіч прысвяціла сваю новую кнігу ўнучцы Алесі. Называецца яна "Як Алеся пальчыкі лічыла". Кнігу складаюць вясёлыя займальныя гісторыі і такія ж вясёлыя маляўнічыя ілюстрацыі да іх. Таму што гэта кніга для дзяцей.

Аўтарка радуе нас дасціпнымі апавяданнямі-мініяцюрамі пра тое, што можна пачуць ад маленькіх “філосафаў”. Кнігу карысна чытаць усёй сям’ёй. Цэлым наборам мудрых выхаваўчых падказак яна зацікавіць і дарослых.

Чарговы крок да заваявання самай патрабавальнай чытацкай аўдыторыі — дзіцячай — зроблены пісьменніцай у выдавецтве “Народная асвета” (Мінск). Наколькі ён удалы, могуць ацаніць наведвальнікі кнігарняў краіны, — кніга ўжо ў продажы. Гарманічнай і неад’емнай часткай зместу кнігі сталі яркія ілюстрацыі (мастак В.У.Фралова). Кніга Людмілы Кебіч “Як Алеся пальчыкі лічыла” адрасавана чытачам дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Наклад новага выдання 1000 асобнікаў.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***